*Даніна пашаны*

# ПАКЛОНІМСЯ ВЯЛІКІМ ТЫМ ПАДЗЕЯМ

**Фінал міжканфесійнай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі» прайшоў учора ў Мінску ў Храме-помніку ў гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія выратаванню Айчыны нашай паслужылі. Ён аб'яднаў валанцёраў руху БРСМ «Добрае Сэрца» з усіх рэгіёнаў краіны, а таксама кіраўнікоў і прадстаўнікоў вядучых канфесій Беларусі, апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь.**

Традыцыйна пачатак мерапрыемству паклала малітва «За мір і стварэнне ў памяць аб загінулых воінах, якія аддалі свае жыцці за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы» ў крыпце Храма-помніка, дзе ў спецыяльных нішах у капсулах захоўваецца зямля з месцаў пахавання воінаў-беларусаў, якія загінулі ўдалечыні ад Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны і іншых войнах, з брацкіх магіл абаронцаў Беларусі, і, вядома ж, Брэсцкай крэпасці-героя.

Яшчэ адна традыцыя валанцёраў БРСМ — напоўніць фінальныя мерапрыемствы элементамі стваральнай дабрадзейнасці. Закласці на тэрыторыі храма яблыневую алею, устанавіць арт-аб'ект, распісаць сцяну фасада трансфарматарнай падстанцыі на тэму роднай прыроды або пафарбаваць лаўкі, прыбраць лістоту ці пачысціць снег з дарожак. На гэты раз хлопцы і дзяўчаты займаліся падрыхтоўкай да зімоўкі пладовых дрэў.

Апоўдні ў Белай зале Храма-помніка разгарнулася фотавыстава «Ад забыцця да глыбокай павагі: 10 гадоў аднаўлення святынь», а таксама майстар-класы па вырабе калядных анёлаў. Тут можна было навучыцца рабіць бірулькі з сімваламі шчасця і цяпла, надзеі і здзяйснення жаданняў з фетру, а таксама паўдзельнічаць у вырабе анёлкаў у тэхніках «Арыгамі», «Выцінанка», «Квілінг», «Скетчынг» і з пацерак.

Цэнтральная падзея дня — міжканфесійны адкрыты дыялог «Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера». У пачатку актуальнай дыскусіі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандра Ганчарова ўручыла дырэктару Брэсцкага абласнога цэнтра маладзёжнай творчасці Віктару Іванову чарговы грашовы сертыфікат на стварэнне адукацыйна-аздараўленчай установы «Рэспубліканскі цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі».



Будаўніцтва знакавага аб'екта на тэрыторыі Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці пачалося 11 лістапада. На новай Усебеларускай маладзёжнай будоўлі працуюць не толькі байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў БРСМ. Адмысловая місія тут у добраахвотнікаў. Нагадаем, кожны можа ўнесці пасільны ўклад у стварэнне патрыятычнага цэнтра праз дабрачынны рахунак для добраахвотнага збору грашовых сродкаў.

Дзясяты сезон міжканфесійнай дабрачыннай акцыі завяршае яе трылогію, якая з 2020 года праходзіла пад слоганам «Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера». За тры гады ў акцыі прынялі ўдзел 10 578 добраахвотнікаў у 875 дабрачынных мерапрыемствах. Толькі ў Год міру і стваральнай працы адбылося 26 добраўпарадкаванняў сацыяльна значных рэлігійных аб'ектаў, помнікаў часоў Вялікай Айчыннай вайны, месцаў воінскага гераізму і славы. Сумесна з прадстаўнікамі асноўных канфесій Беларусі ў іх узялі ўдзел 3249 добраахвотнікаў БРСМ. 38 аб'ектаў было аліўбавана ў рамках міжнароднага гісторыка-патрыятычнага праекта «Лічбавая Зорка».

Ідэйным натхняльнікам рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі» з 2013 года выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. У 2016 годзе акцыя атрымала падтрымку апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь, статус міжканфесійнай. Яна рэалізоўваецца з мэтай умацавання міжканфесійнага і нацыянальнага адзінства.

Штогод у ходзе акцыі добраахвотнікі валанцёрскага руху БРСМ «Добрае Сэрца» працуюць на добраўпарадкаванні і аднаўленні культавых аб'ектаў (святынь) — храмаў, манастыроў, свяцілішчаў, капліц, прыдарожных крыжоў, святых крыніц, камянёў і інш., распрацоўваюць новыя экскурсійныя маршруты «Святыні Беларусі». У цэнтры ўвагі і клопату моладзі таксама помнікі вайсковай славы і брацкія магілы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*Рука дапамогі*

# «ШЧЫТ» СУПРАЦЬ НАРКАМАНІІ

**Маладзёжны парламент пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь даў старт інфармацыйна-прафілактычнаму праекту «Маладзёжны шчыт». Ён накіраваны на супрацьдзеянне незаконнаму абароту наркатычных рэчываў і прафілактыку наркаманіі сярод моладзі.**

Маладзёжны парламент пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь распрацаваў інфармацыйныя матэрыялы і ўнікальную інтэрактыўную прэзентацыю для правядзення сустрэч з рознымі катэгорыямі моладзі (навучэнскай, працоўнай) у фармаце адкрытага дыялогу.

Унікальнасць матэрыялам дадаюць фота і відэа рэальных рэчываў, перапісак з нарканаймальнікамі ў сацыяльных сетках. Адлюстравана работа сапраўдных наркакрам, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі. Сабраная інфармацыя ўзята з крымінальных спраў у адносінах да маладых асоб, якія былі затрыманы «на закладках», за захоўванне і спажыванне наркатычных рэчываў.

У матэрыялах сабраны статыстыка, адказнасць, наступствы наркаспажывання і распаўсюджвання, інтэрв'ю з асуджанымі. Асаблівая ўвага — як маладых людзей спрабуюць прыцягнуць на работу наркакур'ерамі, абяцаючы «вялікі заробак» і выкарыстоўваючы розныя псіхалагічныя прыёмы, махлярства.

Члены Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь на пастаяннай аснове будуць праводзіць сустрэчы з моладдзю, накіраваныя на прафілактыку наркаманіі.

*Навука «ў полі»*

# Будучых чыгуначнікаў паклікаў злёт

**Беларуская чыгунка ўпершыню правяла злёт навучэнцаў транспартных класаў чыгуначнай накіраванасці ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Ён быў арганізаваны ў мэтах папулярызацыі чыгуначных прафесій і прафесійнай арыентацыі моладзі. Дэвізам злёту сталі словы «Разам па дарозе магчымасцяў!»**

У мерапрыемстве прымалі ўдзел больш за 120 навучэнцаў транспартных і профільных класаў чыгуначнай накіраванасці з 14 школ Мінска, Оршы, Баранавіч, Ліды, Лунінца, Брэста, Гомеля, Жлобіна, Калінкавічаў, Светлагорска, Магілёва і Віцебска, а таксама выхаванцы Дзіцячай чыгункі імя К. С. Заслонава, навучэнцы каледжаў — філіялаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту і Мінскага дзяржаўнага каледжа чыгуначнага транспарту імя Я. П. Юшкевіча.

Удзельнікаў злёту чакала насычаная і пазнавальная двухдзённая праграма ў Мінску і Баранавічах, падчас якой юнакі і дзяўчаты наведалі вытворчыя і культурныя аб'екты Беларускай чыгункі, пазнаёміліся са славутасцямі сталіцы, а таксама прадэманстравалі інтэлектуальныя і спартыўныя магчымасці.

Першы транспартны клас у Беларусі адкрыўся ў верасні 2012 года ў Магілёве. Цяпер у нашай краіне функцыянуе 19 транспартных і профільных класаў, у якіх праходзяць навучанне больш як 350 юнакоў і дзяўчат.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Погляд праз час*

# «Першая луста» майго творчага хлеба

## Успаміны маладога чырваназменаўца 70-х

**У газету мяне прывяла апошняя падчас вучобы журналісцкая практыка. Было гэта вясной 1976 года. І запомнілася гэтая практыка найперш тым, што ў маёй маладой сям'і нарадзіўся першынец — сын. Шчасце здавалася такім прыгожым і бязмежным, што «свярбелі» рукі ад жадання напісаць што-небудзь такое, каб гэта заўважылі і сябры-аднакурснікі, і, вядома, супрацоўнікі рэдакцыі, не кажучы ўжо пра жонку, якая зрабіла мне такі цудоўны падарунак.**

Дапамог выпадак: галоўны рэдактар газеты Уладзімір Канстанцінавіч Касько па запыце ЦК ЛКСМБ прапанаваў маю кандыдатуру ў склад рабочай групы для вывучэння стану камсамольскіх спраў на Полаччыне. Тады ў старажытны Полацк можна было даляцець самалётам, і мы паляцелі — на АН-24.

Камандзіроўка была нядоўгай, але мне, журналісту-пачаткоўцу, пашчасціла знайсці матэрыял для артыкула — у адной з вёсак раёна якраз на той час спыніў сваю дзейнасць аматарскі калектыў маладых артыстаў. Як так здарылася — пра гэта і напісаў у артыкуле «Чаму не звіняць «Крыніцы»?»

Праз тры месяцы я трапіў у «Чырвонку» ўжо па размеркаванні. Не скажу, што ў калектыве мяне прынялі адразу добразычліва: пасада, на якую мяне прызначылі (загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі, а ў дадатак, праз некаторы час, і членам рэдкалегіі), выклікала ў некаторых калег скептыцызм: пра што тут можна пісаць?! Аднак я шукаў і знаходзіў тэмы і сам, і, зразумела, з падказкай галоўнага рэдактара і яго намесніка, які быў куратарам майго аддзела (Анатоль Іванавіч Бутэвіч — будучы міністр, надзвычайны і паўнамоцны пасол, таленавіты пісьменнік-сучаснік).

Добра запомнілася вось такое рэдакцыйнае заданне: напісаць пра шчаслівую камсамольскую сям'ю. Стаў распытваць сваіх сяброў і знаёмых, і мне падказалі, што такую сям'ю ведаюць у Стоўбцах. І адпаведны артыкул пасля камандзіроўкі з'явіўся ў «Чырвонцы».

Праца ў газеце адметная тым, што тут не шкадуюць слоў для крытыкі апублікаваных матэрыялаў. Зроблена малапрафесійна — табе адразу скажуць у вочы. І гэта правільна, таму што толькі аб'ектыўная ацэнка спрыяе прафесійнаму росту, дапамагае своечасова заўважыць творчыя недаробкі.

Памятаю, як у рэдакцыі сур'ёзна ставіліся да загалоўкаў матэрыялаў. Сярод калег просьба падказаць назву артыкула ці інтэрв'ю была звыклай: нават абяцалі за гэта тры рублі (тыя савецкія).

Была ў той час у рэдакцыі і камсамольская арганізацыя, сакратарам абралі мяне. Праўдзілі, як і ва ўсім камсамоле, сходы па актуальных пытаннях жыцця, горача спрачаліся, але гэта ніколі не пераходзіла межаў прыстойнасці.

Памятаю, хутка сабралі і сваю футбольную каманду. Прымалі ўдзел у спаборніцтвах па футболе сярод рэдакцый Мінска — і выйшлі пераможцамі. Маё выступленне ў амплуа варатара закончылася сумна: нападаючы газеты «Во славу Родины» выходзіў адзін на адзін са мною на вароты чырваназменаўцаў, я ўпаў яму ў ногі, а ён жорсткім ударам выбіў мне палец на правай руцэ, пасля чаго мяне адправілі ў траўмапункт. А каманда выязджала яшчэ на гульню ў Літву, у Вільнюс.

Пры рэдакцыі працавала літаратурнае аб'яднанне, праз творчую школу якога прайшлі многія сённяшнія беларускія пісьменнікі. Цяпер шмат хто з іх з гонарам успамінае: мая першая літаратурная публікацыя была на старонках «Чырвонай змены»!

Згадваючы сваю працу ў «Чырвонцы», не перастаю здзіўляцца, які быў цікавы калектыў, колькі таленавітых людзей тут працавала: Ігар Рыжкоў, Іван Герасюк, Георгій Клябанаў, Анатоль Мяснікоў, Галіна Пшонік, Нэля Калеснік, Ніна Жалязоўская, Людміла Нарубіна, Наталля Сацук, Уладзімір Напрэеў, Таццяна Дзмітрусёва, Валерый Шыханцоў, Яўген Крупенька...

На вялікі жаль, некаторыя з іх ужо пакінулі наш свет. Але ў маёй памяці яны застануцца як людзі, якія любілі сваю прафесію і адказна ставіліся да выканання прафесійнага абавязку.

**Іван КАРЭНДА**, *паэт.*